# Л.4. Зямны магнетызм

## Змест:

1. Магніты. Магнітнае поле
2. Зямля – вялікі магніт
3. Прырода магнітнага поля Зямлі
4. Магнітная бура, палярнае ззянне
5. Прымяненне зямнога магнетызму
6. Палеамагнетызм
7. Магнетызм і жывая прырода
8. Компас

# Магніты. Магнітнае поле

Магнітныя з’явы былі вядомы яшчэ ў глыбокай старажытнасці пры назіранні ўласцівасцей прыроднага магнітнага жалязняка (закісь-вокісь жалеза $FeO \cdot Fe_2O_3$) па прыцягванню жалезных прадметаў і іх намагнічэнні.

Першае падрабязнае даследаванне і апісанне ўласцівасцей пастаянных магнітаў выканаў у 1600 годзе англійскі фізік У.Гільберт, які ў сваім сачыненні “Аб магніце, магнітных целах і вялікім магніце – Зямля” апісаў больш за 600 доследаў па магнітных і электрычных з’явах.

Высветлілася, што пастаянны магніт мае два полюса:

паўночны (N – north) і паўднёвы (S – south) і размешчаную паміж імі нейтральную зону.

У залежнасці ад арыентацыі полюсаў праяўляецца ці адштурхванне, ці прыцяжэнне.





Ужо ў XVIII ст. была звернута ўвага на тое, што ў выніку навальнічнага разраду жалезныя прадметы намагнічваліся, а компас перамагнічваўся.

Гэта наводзіла на думку, што магнітныя з’явы звязаны з электрычнымі.



У 1820г. дацкі фізік Х. Эрстэд эксперыментальна ўстанавіў, што электрычны ток у праваднiку, як і пастаянны магніт, уздзейнічае на магнітную стрэлку.

У той жа час французскі фізік А.Ампер эксперыментальна выявіў і даследаў магнітнае ўзаемадзеянне токаў.

У XIXст. было ўстаноўлена, што магнітныя ўзаемадзеянні ўласцівы толькі электрычным зарадам, якія рухаюцца.



Такім чынам, было высветлена: вакол зарадаў, што рухаюцца, узнікае яшчэ адзін тып поля – магнітнае поле.

Магнітнае поле зручна адлюстроўваць з дапамогай **сілавых ліній.**




У 1820г. **А.Ампер** выказаў гіпотэзу аб тым, што магнітныя ўласцівасці пастаянных магнітаў (магнетыкаў) абумоўлены існаваннем у іх элементарных **кругавых токаў.**

Сучасныя ўяўленні аб будове рэчыва дазваляюць звязаць гіпатэтычныя мікратокі Ампера з **рухам электронаў у атаме вакол ядра.**

Доследы паказваюць, што ўсе рэчыва, змешчаныя ў магнітнае поле, набываюць магнітныя ўласцівасці – **намагнічваюцца.**

Пры гэтым адны рэчыва аслабляюць вонкавае поле – **дыямагнетыкі,** другія узмацняюць – **парамагнетыкі.**

Сярод якіх ёсць група рэчываў, якія вызываюць вельмі моцнае ўзмацненне – **ферамагнетыкі.**

**Дыамагнетыкі – фосфар, сера, вуглярод, вада, вісмут, золата, серабро, медзь і інш.**

**Парамагнетыкі – кісларод, азот, алюміній, вальфрам, плаціна і інш.**

**Ферамагнетыкі – жалеза, нікель, кобальт, гадалініій, дыспрозій, сплавы марганца і хрома.**



# Зямля – вялікі магніт

**Планета Зямля мае форму эліпсоіда вярчэння (рознасць радыусаў на экватары $R_э$ і полюсах $R_п$ складае 21 км). Прыблізна можна лічыць яе як шар з сярэднім радыусам 6370 км.**



Гэты шар намагнічаны і валодае **магнітным полем** – гэта гіганцкі магніт, які змешчаны прыблізна на **400 км** ад цэнтра ў бок Ціхага акіяна і нахілены да восі вярчэння на **$11{,}5^0$**.




Паўднёвы магнітны полюс ($S_м$) размешчаны ў Арктыцы, паўночны ($N_м$) – у Антарктыцы.

**Для зручнасці магнітнае поле Зямлі характарызуюць наступнымі велічынямі:**

**$B_т$ – індукцыя магнітнага поля Зямлі,**



$B_н$ – гарызантальная складальная індукцыі магнітнага поля,

$B_z$ – вертыкальная складальная індукцыі магнітнага поля,



**α - магнітнае нахіленне,**

**$\phi_м$ – магнітнае схіленне.**



**Накірунак стрэлкі компаса ў кожным пункце Зямлі супадае з магнітным мерыдыянам.**

**Каля магнітных полюсаў стрэлка компаса займае вертыкальнае становішча($\alpha=90^0$, $B_т=B_z$).**

**На магнітным экватары ($\alpha=0^0$) стрэлка займае гарызантальнае становішча ($B_т=B_н$).**



**Напружанасць геамагнітнага поля ($H=B/\mu_0\mu$) не вялікая каля 25 А/м на экватары і 48 А/м – на полюсах.**

**Гэта вельмі слабое магнітнае поле, якое ўступае па напружанасці полю звычайнага школьнага магніта ў дзесяткі разоў.**



# Прырода зямнога магнетызму

**Прырода магнітнага поля Зямлі да гэтай пары дасканала не вядома.**

**У сярэднявечы лічылі, што стрэлка компаса прыцягваецца таямнічай сілай Палярнай зоркі.**

**У XVI-XVII ст. - магнітнае поле Зямлі ствараецца высокамагнітнымі породамі ці жалезам, якія знаходзяцца ў нетрах Зямлі.**

**Неаднароднасць размеркавання жалезных мас у Зямлі стварае магнітныя анамаліі.**

**1820г.** – пасля даследаў Эрстэда і гіпотэзы Ампера было зроблена шмат спробаў растлумачыць зямны магнетызм як дзеянне электрычных токаў, якія цыркуліруюць унутры Зямлі.

**1835г.** – тэорыя І.М.Сіманава – магнітнае поле Зямлі – сукупнасць магнітных палёў маленькіх магнітных часціц, якія роўнамерна размеркаваны ўнутры Зямлі.

У сучасны момант існуе шмат тэорый зямнога магнетызму.

Іх можна падзяліць на дзве групы.

Да першай адносяцца тыя, што тлумачаць магнетызм з дапамогай электрычных такаў.

Да другой – што тлумачаць магнетызм на аснове намагнічэння парод, якія складаюць нетры зямнога шара і яго кару.

**У вадкім ядры Зямлі ($R_я$~2900км) з-за рознасці тэмператур (3000 – 5000$^0$C) узнікае канвекцыйны рух матэрыі.**

**І калі ў ядры існуе слабае магнітнае поле, то будзе ўзнікаць электрычны ток.**

**Магнітнае поле гэтых віхравых токаў утварае зямны магнетызм – дынаматэорыя (не завершана, з многімі дапушчэннямі).**




**Прыхільнікаў дынаматэорыі больш за іншых.**

**Другая тэорыя – ферамагнітная – магнетызм Зямлі тлумачыцца магнетызмам рэчыва зямной кары (h~100км), яго ферамагнітнымі ўласцівасцямі.**

**Дапускаюць, што ~ 30% зямнога магнетызму ствараецца ферамагнетызмам, а ~ 70% - токамі ў ядры.**



# Магнітная бура. Палярнае ззянне

**Лепш ідуць справы з тлумачэннем сутачных змяненняў магнітнага поля Зямлі і магнітнай буры.**

**Калі крыніцы, што вызываюць зямны магнетызм знаходзяцца ўнутры, то крыніцы, якія вызываюць магнітную буру, з'яўляюцца вонкавымі.**

**Перыядычныя сутачныя варыацыі зямнога магнетызму ўзнікаюць у выніку таго, што Сонца вельмі інтэнсіўна выпраменьвае ўльтрафіялет.**

**Ультрафіялетавыя прамяні пранікаюць у атмасферу Зямлі.**

**Частка дасягае паверхні Зямлі, другая паглынаецца атмасферай.**

**Пры гэтым энергія ўльтрафіялетавага выпраменьвання трацiцца на іанізацыю часцiц паветра ў самых верхнiх слаях атмасферы.**

**У выніку гэтага ўзнікае слой з вялікай электрычнай праводнасцю – іонасфера, мяжа якой пачынаецца на вышыні каля 60км ад зямной паверхні.**

Праводнасць іонасферы прыблізна роўная праводнасці марской вады ($\sigma$=3,3 Ом$^{-1}$м$^{-1}$).

Падобна вадзе акіянаў і мораў іонасфера зведвае прыліўны рух пад уздзеяннем Сонца.

Рух асобных вобласцей іонасферы ў магнітным полі Зямлі прыводзіць да ўзнікнення электрычных токаў складанай канфігурацыі.

Гэтыя токі ствараюць у іонасферы магнітнае поле, якое назіраецца на Зямлі ў выглядзе сутачных варыяцый (змяненняў).

Яны залежаць ад палажэння Сонца на працягу сутак.

Летнім днём, калі ўльтрафіялетавае выпраменьванне Сонца вельмі інтэнсіўнае, сутачныя варыяцыі магнітнага поля Зямлі бываюць вялікімі і неспакойнымі.

Зімовай ноччу, яны маюць меншую велічыню і працякаюць спакойна.

**Магнітная бура**. Паверхня Сонца часам пакрываецца цёмнымі плямамі, што ўзнікаюць у момант сонечных успышак (выбухаў).

Па сваёй магутнасці гэтыя ўспышкі роўныя выбухам многіх тысяч атамных бомбаў.

**Пры гэтым Сонца выпраменьвае магутныя патокі пратонаў і электронаў з хуткасцю (1000–2000)км/с, якія утвараюць сонечны вецер.**

**Крыніцай гэтых патокаў з’яўляецца сонечная карона.**

**Гэтыя часціцы праз суткі ці двое дасягаюць Зямлі і ахопліваюць яе магутным воблакам.**

**Пад уздзеяннем магнітнага поля Зямлі паток зараджаных часціц падзяляецца: пратоны адхіляюцца ў адзін бок, электроны – у другі.**

**Калязямная вобласць прасторы, дзе на часціцы пачынае дзейнічаць магнітнае поле Зямлі, называецца магнітасферай.**

**Пад уздзеяннем сілы Лорэнца**

$F = q \vartheta B \sin\alpha$ **зараджаная часціца рухаецца па спіралі вакол лініі магнітнай індукцыі.**

**Гэта прыводзіць да ўзнікнення токаў вакол Зямлі на адлегласцях ~ (20000–30000)км ад яе.**

**Гэтыя токі ствараюць дадатковая магнітнае поле, што прыводзіць да ўзмацнення магнітнага поля Зямлі ў асобных месцах прасторы.**




**Гарызантальная складальная $B_н$ геамагнітнага поля пры гэтым павялічваецца.**

Так узнікае магнітная бура (павелічэнне магутнасці магнітнага поля), якая ахоплівае зямны шар.

Магнітная бура доўжыцца ад некалькіх гадзін да некалькіх дзён, пакуль не рассеяцца воблака зараджаных часціц.

У сувязі з тым, што каля полюсаў магнітнае поле Зямлі больш магутнае, канцэнтрацыя пратонаў і электронаў там максімальная.

Таму ў палярных раёнах змяненні магнітнага поля назіраюцца часцей і бываюць больш інтэнсіўнымі.

**У палярных раёнах узнікае цікавая і прыгожая з’ява – палярнае ззянне (паўночнае ззянне).**

**Гэта ззянне ўяўляе ні што іншае як свячэнне верхніх слаёў атмасферы на вышынях каля 100км.**

**Свячэнне выклікаецца патокам зараджаных часціц, якія іанізуюць атмасферу.**

Аднак доля зараджаных часціц, якія пранікаюць у зямную атмасферу, вельмі малая ў параўнанні з іх патокам, які сустракае магнітасфера нашай планеты.

Такім чынам, геамагнітнае поле надзейна засцярагае біясферу Зямлі ад пагубнага дзеяння сонечнага ветра.





# Прымяненне зямнога магнетызму

У сучасны момант увесь зямны шар пакрыты **сеткай устаноў**, якія праводзяць сістэматычныя даследаванні магнітнага поля Зямлі.

На значнай частцы зямнога шара праведзена **аэрамагнітнае зніманне.**

На падставе гэтага выпрацоўваюцца дастаткова надзейныя **магнітныя карты** для марской і паветранай навігацыі, а таксама для геалогіі, тапаграфіі і іншых мэт.

Больш за **150** буйных магнітных абсерваторый свету здзяйсняюць непарыўныя рэгістрацыі магнітнага поля Зямлі.

**У XX ст. зямны магнетызм стаў шырока выкарыстоўвацца ў геалогіі.**

**Магнітаметрычныя прыборы атрымалі шырокае прымяненне для пошуку карысных выкапняў, у першую чаргу, жалезнай і іншай руды, неабходных для прамысловасці.**

**Прымяненне магнітнага метаду разведкі карысных выкапняў пачало вельмі эфектыўна выкарыстоўвацца з 1936г.**

**Расейскі геафізік А.А.Лагачоў пабудаваў прыбор, які дазваляў праводзіць магнітаразведку з самалёта.**

**Гэта прывяло да павелічэння скорасці і дакладнасці разведкі.**

**Дало магчымасць ажыццяўляць яе ў месцах недаступных для чалавека (горы, тайга, балота, пустыні).**

**Цяпер аэрамагнітнае зніманне выкарыстоўваецца ва ўсім свеце.**

**З дапамогай аэрамагнітометраў, размешчаных на ракетных снарадах, атрыманы звесткі аб магнітным полі на вышынях ад 100км да $10^6$км.**

**Былі праведзены вымярэнні магнітных палёў Месяца і Марса.**

У апошні час узнік яшчэ адзін накірунак практычнага выкарыстання зямнога магнетызму – **інжынерны.**

Пры будаўніцтве гідрастанцый, плацін, каналаў важна ведаць, якія пароды залягаюць у месцах будаўніцтва.

Ці вытрымаюць яны нагрузку гэтага магутнага збудавання. Так узнікла **інжынерная геафізіка.**

Вывучэнне магнітных уласцівасцей горнай пароды прывяло да адкрыцця **палеамагнетызму.**



# Палеамагнетызм

Магнітныя анамаліі Зямлі ствараюцца пародай, якая складае зямную кару, і валодае рознай уласцівасцю і намагнічаннасцю (граніты, базальты і г.д.).

Кавалкі гэтай пароды ўяўляюць прыродныя магніты, якія былі намагнічаны полем Зямлі ў працэсе крысталізацыі з расплаўленнай магмы.

Магнітныя ўласцівасці пародзе надае магнетыт, утрыманне якога ў базальтах складае (10-15)%.

Дзякуючы наяўнасці магнетыту каменная парода зберагае тое намагнічэнне, якое яна набыла ў момант свайго ўзнікнення.

Такое намагнічэнне называецца пастаянным ці астатковым.

Астатковае намагнічэнне – гэта своеасаблівая “магнітная памяць” ці “магнітны адбітак”.

Падобна памяці чалавека парода ўтрымлівае свае магнітныя ўспаміны ў выглядзе астатковага намагнічэння.

Астатковае намагнічэнне цяпер называюць палеамагнетызмам ці “выкапнёвым магнетызмам”.

**Палеамагнетызм – навука аб магнітным полі Зямлі ў мінулыя геалагічныя эпохі.**

**Метадамі палеамагнетызму можна дастаткова надзейна вызначыць велічыню і накірунак магнітнага поля Зямлі ў мінулым.**

**Зрабіць высновы аб геалагічных працэсах, якія прайшла парода з дня свайго існавання.**

**Палеамагнітныя даследаванні паказваюць, што зямное магнітнае поле на працягу $4 \cdot 10^9$ гадоў, якія прайшлі з моманту ўзнікнення планеты Зямля, зведало значныя змяненні.**

**Так, з часоў палеазойскай эры (~ 570 млн. гадоў назад) магнітныя полюсы Зямлі, размешчаныя ў раёне экватара, паступова змяшчаліся на поўнач.**



“Выкапнёвы магнетызм” выяўлены ў кераміцы (гліняны посуд, цагліны і інш.)

Вывучэнне гісторыі геамагнітнага поля па кераміцы называецца археамагнетызмам.

# Магнетызм і жывая прырода

Клеткі – гэта “цаглінкі”, з якіх пабудавана ўсё жывое на Зямлі.

Жывая клетка ў біялогіі іграе такую ж ролю, як атам у фізіцы.

Як вядома, клетка складаецца з нуклеінавай кіслаты і бялка, якія вызначаюць спадчыннасць, нервовую дзейнасць, рост і развіццё арганізма.

Біяфізікі ўстанавілі цікавыя залежнасці паміж магнітнымі і электрычнымі ўласцівасцямі (з’явамі) і цыкламі дзялення клеткі.

Доследы з **насеннем** пшаніцы, кукурузы і гароха паказалі, што іх прарошчванне адбывалася больш эфектыўна, калі іх зародкі былі звернуты ў бок паўднёвага магнітнага полюса Зямлі.

У **карасей** выпрацоўваюцца ўмоўныя рэфлексы на магнітнае поле.

Вусікі **мураў'ёў** размяшчаюцца паралельна слабаму магнітнаму полю.

У **мышэй**, якія знаходзяцца ў магнітным полі, колькасць белых цельцаў у крыві спачатку паніжаецца, а затым узрастае.

**Адсюль выснова:** магнітнае поле дзейнічае на крыватворныя органы жывога арганізма прама процілегла іанізуючай радыяцыі.

**Узнікае пытанне:** ці не можа магнітнае поле служыць аховай ад прамянёвага ўздзеяння?

**Дослед**: мышэй ва ўзросце 9 і 40 тыдняў трымалі на працягу (5 - 14) дзён у пастаянным магнітным полі, а затым іх апраменьвалі радыеактыўным кобальтам.

Аказалася, што пасля гэтага ад іанізуючага выпраменьвання мышэй гіне на (5 – 30)% меней, чым звычайна.

Калі ў магнітнае поле змясціць мышэй адразу пасля апраменьвання, то выжывае іх у два разы больш.

Цікава, што пад уздзеяннем магнітнага поля адбываецца амаладжэнне старых мышэй – іх футра становіцца гладкай, бліскучай, скура губляе складкі.

Магнітнае поле ўплывае і на чалавека.

Медыкі выявілі, што ў перыяды магнітнай буры павялічваеццца колькасць сардэчна-сасудзістых захворванняў, павышаецца смяротнасць, пагоршваецца стан хворых, якія пакутуюуь ад гіпертаніі.

Здаровы арганізм, як правіла, адаптуецца да змянення вонкавых умоў.

У хворага адаптацыя паніжаецца, што прыводзіць да адмоўнага ўздзеяння на іх электрычных і магнітных палёў.



# Компас

“Магнітны компас – прыбор маленькі, але без яго Амерыка не была бы адкрыта!” – гаворацць маракі.

Ён стварыў эпоху караблеваджэння і сёння не згубіў свайго значэння.

4000 гадоў таму ў Кітаі была вядома здольнасць прыроднага магніта ўстанаўлівацца адным канцом на поўдзень, другі на поўнач.

Першы компас (кітайскі) – сасуд з вадой – драўляны паплавок, а на ім карычневы камень (магніт), які “любіць жалеза”.

**Кітайцы пісалі: ”Магніт – гэта камень, які дае накірунак магнітнай іголцы”.**

**Компас па англійскі: намагнічанай жалезнай іголкай пратыкалі саломінку, якая плавала ў вадзе, і па вярчэнню сістэмы іголка-саломінка вызначалі накірунак на поўнач.**

**У 1269 годзе французскі вучоны Пьер дэ Мерыкур (Перэгрын) стварае дзве канструкцыі магнітных компасаў.**

**Адзін з іх утрымлівае магніт, што плавае, другі – “сухую” намагнічанную сістэму, якая паварочваецца разам з вертыкальнай воссю.**

Асаблівасць “сухога” компаса ў тым, што ён утрымлівае шкалу, якая мае 360 дзяленняў і спецыяльную лінейку, з дапамогай якой можна вымяраць азімуты свяціл.

Кітайцы лічылі, што стрэлка компаса паварочваецца да Палярнай зоркі.




Перэгрын – да полюса.

Ён прыйшоў да высновы:

зямны магнетызм – прычына павароту стрэлкі магнітнага компаса.

# Компас італьянца Флавіа Жыойя (пачатак XIV ст.)




1 - шкала,
2 - лінейка,
3 - стрэлка,
4 - іголка,
5 - вось.

Лічыцца, што Флавіа Жыойя стварыў картушку – паперны круг, змацаваны з магнітнай стрэлкай, і падзеляны на 32 часткі, якія вядомы маракам пад назвай румбаў ці “розы вятроў”.




У такім выглядзе без значных змяненняў компас існуе і ў нашы дні. “Компас” ад старажытнага англійскага “compass”, што азначае “круг”.